**Вольга Гапеева**

# *Няголены ранак*

www.kamunikat.org

Мінск
Выдавец І. П. Логвінаў
2008

УДК 881.161.3-1
ББК 84 (4Беи)-5
Г 19

**Гапеева, В.**

Г 19 Няголены ранак / Вольга Гапеева. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2008. – 56 с.

ISBN 978-985-6800-77-4.

Доўгачаканы праект сучаснай беларускай літаратуры — новая кніга Вольгі Гапеевай — ўмяшчае вершы апошніх гадоў. «Няголены Ранак» гэта шчырасьць, якая часам мяжуе з агаленасьцю, медытатыўнасьць, што можа ўвесьці ў транс і разважаньні пад [illegible].

УДК 881.161.3-1
ББК 84 (4Беи)-5

ISBN 978-985-6800-77-4

© Гапеева В., 2008
© Выдавец Логвінаў І. П., 2008

www.kamunikat.org

# 1

www.kamunikat.org

+

Іхнія целы я вуснамі вывучала
забывалася на ўсіх астатніх што ў мяне былі
на тое што трэба дыхаць і есьці
што я не яны
і іншым пачуцьцям належу
І толькі калі імёны іх блытацца пачыналі
я адчыняла
краны з вадою
вокны наросхрыст
слоўнікі
файлы з докаўскім пашырэньнем

нават званіла ў амбасады
каб толькі пачуць што ўсё па-ранейшаму і ўсё на сваіх месцах

У нашых стасунках не было разуменьня пра вочы
толькі слых      толькі форма
    дотык  і  постаць      вага   рытм  і  рухі
націскаў  жорсткія пацалункі        тонаў абдымкі
            ды інтанацыі танцы на самотнай пляцоўцы вакзалаў
зь якіх яны ад'яжджалі
на шчацэ маёй пакідаючы
памадныя петлі

доўга будзе за рот мой трымацца ўсьмешка
напэўна так адчувае сябе блазан калі гледачы разышліся

часам няпроста паверыць што вецер –
                                    усяго толькі розьніца ціскаў
часам словазлучэньне  больш
                                    чым проста зучэньне двух словаў

# 00:05

## Няголены ранак

+

я застаюся
я застаюся віннай табе адну маленькую рэч
пакуль
пакуль высьпявае яна ў манграваым лесе
неба
не ба
яцца ня трэба
пазыкі вяртаць я ўмею
проста пакуль яшчэ рана
рана не зацягнулася добра
і не зацягнула мяне ў ложак
фэя што на паверх вышэй
я абавязкова вярну табе гэту маленькую рэч

вецер гайдае бамбук
такі зялёны і горкі як мой
паца...
па цалафанавым моры я паплыву
каб даплыць і вярнуць адну маленькую рэч
пэкін
31 траўня
год невядомы



www.kamunikat.org

+

*Пакуль ты забываесься на маё імя*
*удзень па літары*
як ніякае іншае цела
я буду ляжаць
пад нацягнутымі дратамі
на ўскрайку
усёдаравальнай электрастанцыі
і як ніякая іншая птушка
схаплюся рукамі
дратоў аголеных
каб скараціцца
пад вокам левым тваім
цяглічай
і зьведаць
чым ёсьць
*імгненьне*

www.kamunikat.org

+

я сыду калі ніхто не сыходзіць
я прыйду калі ня прыйдзе ніхто
верасьнёвая поўня мне грудзі
абмывае штоноч малаком
ты ня сьпіш, ты па вуліцах ловіш
чорных цэрбэраў на сваю душу
павяртайся дадому, родны
не табе і ня я скажу
у маіх валасох вецер
калыхае сваіх ветранят
ты раўнуеш
і на сотай дзяўчыне
ставіш ейнай цнатлівасьці мат
шах!

www.kamunikat.org

+

так і буду стаяць
ля пад’езду не твайго дому
і званіць а дванаццатай ночы чужым людзям
мне ніхто не адчыніць
і ніхто мяне не прагоніць
мокры куст     лужыны
            падарунак
што застаўся ляжаць ля дзьвярэй зьбеглага сьвята
ды абыякавасьць
якая рагоча зь мяне такой недарэчнай
гэта з ёй пасябрую
і магчыма мы пачнём жыць разам
а пасьля ў нас нават з’явяцца дзеці
якім мы ў свой гонар
не дадзім аніякіх імёнаў
і каханьне для нас застанецца
 ніякага роду

www.kamunikat.org

+

на новым трамваі
я ад’язджаю
ад цябе
ад нясказаных словаў
нехта з нас
быў не гатовы
нехта з нас
напалову
галоўнае
ня плакаць і
не прывязвацца
да цёплых словаў
з тваёй інтанацыяй
знайду сабе пугу
каб па позірках хвастаць
што мкнуць да цябе ў палон здацца
- месца!
нават ня думаць пра гэта!
прымушаць сябе есьці
бараніць ад абсэнту
- я з радасьцю з’еду
- ну, а я мушу…

мінус мадальнасьць
такі вось вечар



www.kamunikat.org

+

п а ч ы р в а н е е
хворае сэрца
што сядае ў хмары
на дзень наступны
 абяцаючы тузін сьнегу
ледзь адарваўшы ад замерзлых парэнчаў пяткі
стану на тры сантымэтры бліжэй да
стомы
якую ты разам з хлебам
кідаеш качкам
хруснула нешта
і час цяпер я адлічваю
   па тваім пульсе
    па птушках што заваркай асядуць  на небе
я прадкажу адрэсу ананімнага пацалунка
       па ўзмаху сьцяжка
правадніцы з прычапнога вагону
як шкадлівае сонца
цяпло абяцаючы

www.kamunikat.org

+

у вагоне нумар 898
чыканьне пасьпявае заплесьці коску
да левай скроні прыціскаецца моцна
пытаньне
– Вы сыходзіце на наступным?
не,
я чырвоную кнопку сэрца
націскаю
для экстранай сувязі з машыністам
каб падпісацца пад целам тваім
самым жорсткім сваім кампрамісам

і калі вочы стануць чыстымі ад аблокаў
і калі голас ліосьце назад да дрэваў
уздыме
я ўпаду
як тэмпература за вокнамі
ніжэй спадара Цэльсія
бо той хто носіць са студні вёдры
не абавязкова поўніць вадой іх

вусны звяжу на вузел
на самай мяжы твараў
каб той хто мяне чакае
шанец меў
н е дачакацца

www.kamunikat.org

мужнасьць – гэта тварам
да пасажыраў
сесьці
у поўным тралейбусе
у 22.30
і не забыцца
што невызначальным
можа быць
ня толькі артыкль

www.kamunikat.org

+

Там, дзе пранізьліва грукае вецер у грудзі
І прымушае забыцца на цёплыя дотыкі жыта
Пакідаючы на рукох адзінае выйсьце –
Абдымаюць бясконцасьць за плечы
І
Вызваляюць словы ад інтанацыі
І
Дафніс больш не шукае Хлоі
Бо
Пенялопа даўно ўжо выйшла замуж
І
не істотна што на сьняданак выбраць
ты памятаеш толькі смак хлеба
якім
заядалі масьліны бяз костак
(хоць з косткамі мне падабаліся болей)
ты праглынаеш сьліну - нешта заклала вушы
гэта спачатку вусьціш
а потым яе так мала
і вуснамі сказ за сказам
па вуснах
ты счытваеш прагна
нішто не дарма

www.kamunikat.org

+

вычытаць гэты сьнег
да канца
каб ніводнай памылкі не засталося
калі будзе ён паміраць
наталяючы смагу эмансыпацыйнай зімы
вынесьці на палі птушак чырвоных
каб дзяўблі яны глебу што камянём застрае ў горле
і глытай не глытай
сінія вусны да жыцьця не вярнуць мне
або ня вернуць,
я - нескладовая перад націскам
а дакладней – назоўнік жаночага роду з асновай
на *”г”*
і таму калі мяне праскланяць...
*-дык Вы будзеце што-небудзь браць?*
*-..цукеркі...*
множны лік мае свае перавагі
аднак ёсьць словы якія нельга пісаць разам
таму ў скрайніх выпадках я пішу сябе праз злучок
трымаючы пад паліто
букеты ружовых і жоўтых
мяккіх знакаў
каб паслабіць тваю цьвёрдасьць
але
ты не выключэньне
а я ня правіла

# 00:15

## Няголены ранак

+

Не, мне ня цяжка
уявіць
цябе і статыстыку
цябе і тваіх суседзяў: жанчыну ў міні-спадніцы і
ейнага мужа - кіроўцу фуры
цябе і напаўсляпога сабаку
цябе і дзяўчыну што займаецца ёгай
цябе і мой ровар
цябе і басэйн
які ты так ня любіш
бо зусім ня ўмееш плаваць
а я ўмею
і таму крочу па мосьце

я баюся што ніякія вусны ня змогуць вярнуць мне
жаданьня
прачынацца з раніцы ў ложку ад таго
што анямела рука
бо яе пераціснула цяжарам іншага цела
а ты кажаш, безадказны мінэт…

паспрабуй мяне ўявіць
з мужчынам што крочыць па мосьце
у яго вочы майго дзядулі
мяне і цёплы абсэнт
мяне і зімовае мора
мяне і мае пакусаныя пальцы
мяне без цябе

+

ўся ў панядзелкавых абдымках
званю аўторку
ён моўчкі слухае і плача
яшчэ ня ведаю, што неба
хварэе на боткіна
і нам зь ім у палатах розных
ляжаць
і позіркам блукаць па столі
ня спаць
ў знак салідарнасьці
на волі
той чыё дыханьне казытала левае плячо
гуляе у маджонг да трэцяй ночы
паштовы голуб быў падстрэлены яшчэ ўвосень
на паляваньні дзікім  дзікім ім
яна ж, якой ніколі не было, праіснавала амаль з паўгода
на здымках, зробленых адчаем і маной,
там хтосьці ў доўгім паліто
мне дзьверы адамкнуў і разьвітаўся
“прабач” было не дастаткова
як і кахаць
патрэбны былі словы або сказы якіх я не пасьпела нарадзіць
цяпер не нараджу ўжо ніколі
бо я
у больніцы
а ты
на волі

# 00:17

## Няголены ранак

+

Дзяўчына
давайце рыхтавацца да выхаду
Навошта нам
наступныя станцыі
Нашыя грахі
пачынаюцца з гэтай
Чытайце Біблію
радок дванаццаты
Як, Вы Афелія, што чакае Гамлета?
Дайце зірнуць
у Вашыя вочы
У мяне таксама жыцьця рэзервацыя
З якой так
вырвацца хочацца

з такім каханьнем
каму яна трэба?
нейкаму Богу?
каб гадоў праз семдзесят
атрымаць павышэньне і анёлам лётаць
над горадам
душаў і целаў
грэшных?
у гэтай гульні козырам крыўда
толькі ў мяне
іншыя карты
хто на раздачы?
п’яны мача
тады
нясіце паболей ваты
якая будзе крычаць ад болю

замест мяне
фарбавацца ў колер
якому нават
макі на полі
схіляць
свае і чужыя
галовы

www.kamunikat.org

## 00:19

**Н**яголены ранак

+

як неразношаны абутак
мне цісьне сэрца
і калі не ў памеры справа
тады ў чым
віно гарбата піва
часам кава
такая сынанімія    дачканімія    бяздзетнасьць   і дзеці
па-за шлюбам     не мае
я  н е  м а г у  к а з а ц ь (як зручна што “х” і “з” так
блізка на клявіятуры)
і так ня блізка мы
і шыбеніцы будаўнічых кранаў
на іх штодня я адзіноту
вешаю сваю
(ты са сваёй спраўляйся залпам)
ў бязлюдным парку
буду гвалціць сум
падчас абедзенага перапынку
і
нават згубленая завушніца
не давядзе
што
злодзей гэта я

www.kamunikat.org

# 2

www.kamunikat.org

+

адзінае магчымае імя было на “а”
і заканьчэньне ў яго было на “а”
а пасярод – слупы з перагародкай
такая арфаграфія мне не знаёма
і каб я лепш запомніла яе
ты прыкладаў мой голаў да слупа
каб слухала я ейнае імя
што стала для цябе сынонімам “каханьня”
я ж націскалася на “о”
таму зрабілася сынонімам “было”

www.kamunikat.org

+

ціш на досьвідку прыйдзе бінтаваць маё сэрца
рудаю стужкай
сатканай з кудзерак анёлаў
што часамі сьпяць у трамваях
і сасьніўшы яблык раздора
хутчэй выбягаюць і нясуцца насустрач
самі ня ведаючы каму і навошта

у полі за ветрам гнацца
вось мая справа
бегчы і падаць

www.kamunikat.org

+

У птушак нянавісьці
Твой позірк
Яны крыламі хвастаюць па твары
Іхні шлях пралягае праз маё сэрца
Na pounač  i ù advarotnym kirunku
I tak pry kožnym abdymku
I pry kožnym drugim pacalunku

www.kamunikat.org

+

і так бывае
што сьнег на носе ня тае
і хоць  я тая
што цябе на стужку здымае
мы засынаем
ня з тымі
каго абдымем
у марах
і мне падасца што ўсё ня тое
а твае вусны прашэпчуць
у мой рот:
- наадварот

www.kamunikat.org

+

пішы пішы сваю прозу
пра тое што ружа на лапу азора
упала
пішы і не забывайся
сьмяецца той
хто ўмее сьмяяцца.

www.kamunikat.org

+

мне ня выкінуць жыцьця са слова сьмерць
як дзяўчыну з цела ўласнага мне ня выкінуць
запяклася на грудзёх маіх крывя
запяклася ды асыпалася

www.kamunikat.org

+

застыне лета кропляй мёду
над той радзімкаю што справа
каля яе нібы аправа
складуся зморшчынкаю я
каштану цьвёрдаму зямля
раскрые вусны як дзіцяці
каб у сябе глыбей схаваці
да трэцяга сакавіка

www.kamunikat.org

+

павяртаючыся да ўласнага спаталеньня
маю намер парушыць правіла
і напісаць словы нашыя разам
штотыкажашнічога
яксалатацудоўна
дзе адказ і дзе запыт
мне не істотна
у слоўнік жыцьцёвых цяжкасьцей
варта занесьці:
“Надзвычайная крохкасьць каханка,
і як яго песьціць”

www.kamunikat.org

+

недапабудаваны дом
дрэвы
досыць халодныя думкі
дзервянеюць толькі аднойчы
ўночы
калі моцы няма плакаць

www.kamunikat.org

+

ні каханьня ў мяне ані кар’еры
толькі завушніца ў вусе правым
ды адна ў левым
ні дачкі ня маю ані сына
крумкачоў у полі я чытаць вучыла
я бяз крыўды крыўда без мяне
кагосьці падзялілі
а мяне – не

www.kamunikat.org

# 3

www.kamunikat.org

+

калі ты дрэва
            а вецер сышоў ад цябе
стаяць нерухома можна стагодзьдзямі

і што табе птушкі зь іх звонкімі песьнямі лета

калі ты
 дрэва
ад якога сышоў вецер

www.kamunikat.org

+

як памерці

то  на лузе тваёй сукенкі
быць атручаным                    перасьпелым голасам
крыўды
расшпіліць да апошняга гузіка
                    чэрствасьць
і напоўніць сьпевамі рэха
грудзі

www.kamunikat.org

+

языком бабаўняным
прадзетым праз тонкае вушка вуснаў
ты вышываеш на жываце маім
манаграму

www.kamunikat.org

+

куды мне спрачацца з жоўтымі сьлівамі
што растуць на тваёй радзіме
колер мой іншы

www.kamunikat.org

+

шукала белую радзімку ў стозе сена
а знайшла голку

www.kamunikat.org

**00:39**

**Н**яголены ранак

+

Ісьці па асфальце ў ботах
і думаць пра мора
кратаючы вейкамі
ужо цёплую скуру ветра
спыніцца
і доўга выбіраць кветку
пад колер вачэй тваіх
ірыс

www.kamunikat.org

+

я бяздомныя рухі цела свайго
я бяздомныя рухі цела свайго напаткаю
у завані між караблёў п’яных
дзе павуціньнем разьвесілі кашаль
на дрэвах
аглохлых ад вачэй безьлічы
дзе шкарлупіньне на шкло налепла
мне – не адшкрэбсьці
і белая вусьцішнасьць
матыльком сядае на сьпіну
вольную ад крылаў ад крыкаў ад пацалункаў
мая свабода навыварат
пляце сабе кокан
і кожны з нас вусьцішнасьць
і кожны з нас паасобку

www.kamunikat.org

+

учора бачыў цябе ў небе
ты плыла нібы воблака
і я падумаў
шкада што я не вецер

www.kamunikat.org

+

каб заўважыць прыгажосьць тваіх вачэй
хопіць імгненьня
каб зразумець
– і вечнасьці мала
каб адчуць смак тваіх вуснаў
і пацалунку хопіць
а каб навучыцца чытаць па іх
– і мільярду замала
але кожны дзень
набліжае мяне да патаемнага.

www.kamunikat.org

+

Д мае чоў
оўг ся дзі плы лых нах ней
ія ме ц ы гру лі ў цёп дало тваіх

www.kamunikat.org

**00:44**

Вольга Гапеева

+

чырвоны чалавечак носіцца за голубам
хоча злавіць яго
і распавесьці пра коціка з калыханкі
якую сьпявае мама
калі нікога няма побач

www.kamunikat.org

+

вазьму гэты камень памерам з кулак
і разаб'ю аб твае вершы
аскепкамі ж напішу паэму
пра тое што калісьці тут было маё сэрца

www.kamunikat.org

+

буду рабіць гарбату
ў адзін кубак класьці сем лыжак цукру
а ў іншы дадаваць солі
калі ты не ў маім доме
нават калі ты не ў маім доме
няхай табе будзе салодка

www.kamunikat.org

+

прымусовае шчасьце раздавалі ўчора
на нейкай там штрасэ
да мяне падышлі і сказалі
у вас такія няправільныя вочы вазьміце сабе кавалак
я прынесла яго дадому  паставіла ў шафу
інструкцыю не прачытала
а аказалася
зь ім трэба было жыць

www.kamunikat.org

+

Хутка восень
Іржу
Дастаю з шафы
Мы ідзем на шпацырку
На табе вянок з летніх красак
Ты яшчэ так далёка
Маё вечнае лета
І казытлівае лісьце
Тваіх пацалункаў
Я зьбіраю для сушкі
Каб узімку імі лячыць сваё беднае горла

www.kamunikat.org

+

такі непрыкметны
чырвоны матыль
на чырвоным драконе

www.kamunikat.org

+

Раніца у якой не існуе нічога апроч тваёй сьмерці
калі ты паміраеш не са мной
з кімсьці іншай
разрывае мяне на кавалкі
і парваную
прымушае жыць далей
калі так ня хочацца

www.kamunikat.org

**00:51**

**Н**яголены ранак

+

маленькі поні катае маленькіх дзяцей
за грошы
што плацяць бацькі ягонаму гаспадару
але іх ўсё адно не хапае
каб кожны дзень есьці салодкую моркву
таму на вячэру сёньня
маленькі поні будзе есьці сухую траву

я не падобна на поні        і на маленькіх дзяцей не падобна
можа я морква
а можа трава
якую ты перажоўваеш ужо каторы год

быў час калі я ня ўмела чытаць
і гэта рабіла мама
тады ў кніжцы было напісана
што
маленькі поні катае маленькіх дзяцей
проста так

www.kamunikat.org

+

**МАНІФЭСТ вершаў**

Вершы бываюць розныя.
Яны бываюць высокія і ня вельмі. Жанчыны і ня вельмі.
Вершы таксама растуць, але паліваць іх ня трэба, яны ня дрэвы, а Вы не вада.
Каб верш вырасла ці вырас іх трэба калыхаць.
Трапляюцца некаторыя вершы без нагі ці рукі, але тужыць ня трэба, іх можна адрасьціць, як яшчаркі, што губляюць свае хвасты, а потым зноўку іх знаходзяць.
Праўда ў некаторых вершаў так ніколі і ня вырастаюць крылы, альбо вырастаюць і адвальваюцца. Напэўна ім не хапае кальцыю ў арганізьме, ці што?
Але гэта ўсё потым.
Спачатку верш трэба злавіць.
Вершы… яны разьбягаюцца, гуляюць у хованкі, маскіруюцца пад прозу і ўсё такое.
Таму лепш узяць з сабой сачок.
Самі яны чапляцца ня стануць, толькі калі бяжыць ці едзеш куды, яны разам з ветрам асядаюць на валасах, шчаках, застаюцца на табе як на ветравым шкле, тады толькі пасьпявай іх запісваць.
У нерухомым стане складаней, тут патрэбная прыманка. Вершы-драпежнікі будуць радыя кроплі крыві, сладкаежкі – тоненькаму струменьчыку мёду, што зьбягае з лыжкі назад у слоік..
А потым іхнія трупікі (калі іх назьбіраецца і ня будзе, дзе захоўваць) можна прыбіць да папяровых старонак, выдаць кніжку і будуць у вас свае могілкі.
Хаця ёсьць іншыя падыходы і больш падрабязныя клясыфікацыі, згодна якіх вершы таксама людзі і занадта блізкія кантакты зь імі могуць выклікаць аргазмічны або шызафрынічны стан.

# 00:53

**Н**яголены ранак

## Зьмест

1.

Ікзнія цела я вуснамі вывучала... 5
я застаюся... 6
*Пакуль ты забываесься на маё імя...* 7
я сыду калі ніхто не выходзіць... 8
так і буду стаяць... 9
на новым трамваі... 10
н а ч ы р в а н е е... 11
у вагоне нумар 898... 12
Там, дзе пранізьліва грукае вецер у грудзі... 14
вычытаць гэты сьнег... 15
Не, мне не цяжка... 16
ўся ў панядзелкавых абдымках... 17
Дзяўчына... 19
як неразношаны абутак... 20

2

адзінае магчымае імя было на «а»... 23
ціш на досьвітку прыйдзе бінтаваць маё сэрца... 24
У птушак папавесьці... 25
і так бывае... 26
пішы пішы сваю прозу... 27
мне не выкінуць жыцьця са слова сьмерць... 28
застыне лета кропляй мёду... 29
паварочваючыся да ўласнага спатаеньня... 30
недазабудаваны дом... 31
ні каханьня ў мяне ані кар'еры... 32

3.


калі ты дрэва... 35
як памерці... 36
языком бавоўняным... 37
куды мне спрачацца з жоўтымі сьлівамі... 38
шукала белую радзімку ў стозе сена... 39
Ісьці па асфальце ў ботах... 40
я бяздомныя рухі цела свайго... 41
учора бачыў цябе ў небе... 42
каб заўважыць прыгажосьць тваіх вачэй... 43
Д... 44
чырвоны чалавечак носіцца за голубам... 45
вазьму гэты камень памерам з кулак... 46
буду рабіць гарбату... 47
прымусовае шчасьце раздавалі ўчора... 48
Хутка восень... 49
такі непрыкметны... 50
Раніца... 51
маленькі поні катае маленькіх дзяцей... 52
МАНІФЭСТ вершаў 53


www.kamunikat.org

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Гапеева Вольга**

Няголены ранак
*Вершы*

Кніга выдадзена ў аўтарскай рэдакцыі.

Карэктура Н. Шакун
Дызайн Т. Пашчанка, С. Жданові́ч
Вёрстка С. Кандрашонка

Падпісана ў друк 07.02.2008 г. Фармат 84х108
Папера афсетная. Гарнітура Німбус. Ум. друк. арк. 2,94.
Ул.-выд. арк. 2,5. Наклад 200 асоб. Замова № 170.

Выдавец І. П. Логвінаў
ЛИ 02330/013307 ад 30.04.2004 г.
220050, г. Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 19-5.
logvinovpress@mail.ru
Надрукавана на капіравальна-памнажальнай
тэхніцы ІП Логвінава

ISBN 978-985-6800-77-4

9 789856 800774